Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42

DOI:10.17951/sb.2016.10.211
Studia Białorutenistyczne 10/2016 Językoznawstwo

Ігар Клімаў / Ihar Klimau

Białoruski Państwowy Uniwersytet Kultury i Sztuki (Białoruś)
The Belarusian State University of Culture and Arts (Bielarus)

e-mail: klimau@mail.ru

# Маўленчая аснова і сацыяльная база супольнай кніжна-пісьмовай мовы беларусаў і ўкраінцаў даўніх часоў

*Sociolinguistic Determinants of the Common Writing Language of Belarusians and Ukrainians during the Grand Duchy of Lithuania*

*Uwarunkowania socjolingwistyczne wspólnego dla Białorusinów i Ukraińców języka piśmiennictwa okresu Wielkiego Księstwa Litewskiego*

У сучасным гістарычным мовазнаўстве Беларусі і Украіны прымаецца за пастулат, што аснова „руськай” (старабеларускай/стараўкраінскай, супольнай для даўніх беларусаў і ўкраінцаў) была народная, дэмакратычная, нават гутарковая (var. народна-размоўная, народна-гутарковая і пад.)[1]; або што гэтая мова адлюстроўвала асаблівасці жывой гаворкі[2], пад якой звычайна разумеецца дыялект. Некаторыя даследчыкі нават лічылі, што ў XVI–XVII стст.

[1] П. И. Житецкий, *Очерк литературной истории малорусского наречия в XVII веке с приложением словаря книжной малорусской речи по рукописи XVII века*, Киев 1889, с. 52–53; Ф. Є. Ткач, *До питання про характер української літературної мови у XIV–XVIII століть*, [в:] *Питання історичного розвитку української мови: праці міжвуз. наук. конф.* (*Харків, 15–20 грудня 1959 р.*), *присвячені V Міжнародному з'їздові славістів*, Харків 1962, с. 65–66, 73; А. А. Москаленко, *До походження української писемної і писемно-літературної мови*, „Праці Одеського державного університету”, т. 152. Серія філологічних наук. Вип. 15: *Питання слов'янської філології: Мовознавство*, Одеса 1962, с. 105; *idem*, *Про утворення мови української народності і нації*, „Праці Одеського державного університету”, т. 152. Серія філологічних наук, вип. 15: *Питання слов'янської філології: Мовознавство*, Одеса 1962, с. 130–131, (параўн. с. 135); В. М. Русанівський, *Історія української літературної мови*, [2–е вид., доп. і переробл.], Київ 2001, с. 90–91, 128.

[2] І. С. Свєнціцький, *Елементи живої народної мови в пам'ятках української літературної мови у XIV–XVIII сторіччях*, „Питання українського мовознавства”, Львів 1958, кн. 3, с. 5–8; П. П. Плющ, *Нариси з історії української літературної мови*, Київ 1958, с. 141, 147; Л. М. Шакун, *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*, Мінск 1963, с. 94, 99, 102–103, 133.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



„письменники фактично писали тим чи іншим місцевим діалектом, в якому не все було зрозуміло для представникив інших місцевостей”[3]. Асабліва папулярная такая думка сярод літаратуразнаўцаў і гісторыкаў, як айчынных, так і чужынных.

У сапраўднасці падобны тэзіс пра народную, дыялектную аснову „руськай” мовы ўсур'ёз ніколі не абмяркоўваўся, ва ўсялякім выпадку, не абгрунтоўваўся ўсім дасяжным матэрыялам і рознааспектнымі доказамі. Фактычна ж гэты тэзіс уяўляе сабой хутчэй пастулат, на якім будуюцца розныя гіпотэзы ды канцэпцыі і ад якога адштурхоўваюцца шматлікія прыкладныя даследаванні. Праўда, якраз некаторыя даследаванні асобных помнікаў, як і асобныя заканамернасці развіцця мовы часам пярэчылі такому пастулату (напрыклад, адсутнасць пераемнасці паміж „руськай” мовай і сучаснымі літаратурнымі мовамі ўкраінцаў і беларусаў), аднак гэта часта не заўважалася ці канстатавалася як факт, без далейшага тлумачэння і асэнсавання.

Што было горш, гэты пастулат скіроўваў даследчыкаў ісці ў не зусім правільным кірунку. Практычна ўсе даследаванні руських помнікаў арыентаваліся пераважна на пошук жывамоўнага ўплыву (пад якім разумеўся амаль выключна дыялектны) пры выразным ігнараванні ці павярхоўным вывучэнні ролі элементаў астатніх – чужамоўных, кніжных, штучных або архаічных. Такія элементы апрыёрна лічыліся ненатуральнымі і ганіліся[4], выводзіліся, так бы мовіць, за рамкі асноўнага аналізу, які канцэнтраваўся пераважна на пошку дыялектнага матэрыялу. Зразумела, такія элементы вывучаліся, але толькі як неарганічны дамешак да жывамоўнай асновы (архаізмы) ці як сведчанне іншамоўных уплываў (запазычанні). Інакшага асэнсавання ролі гэтых элементаў звычайна не прапаноўвалася, калі не лічыць спроб мінімізаваць ролю такіх элементаў шляхам абвяшчэння іх вузкалакальнымі сродкамі ці спецыяльнымі тэрмінамі[5]. Пры гэтым даволі слаба выкарыстоўваліся статыстычныя методыкі ці нават проста падлікі, якія маглі б паказаць адносную вагу і значэнне тых або іншых элементаў у помніку ці ў пісьменстве.

Падобны падыход зараз здаецца заганным: ён ігнаруе тыя элементы, якія хаця і не з'яўляюцца аўтахтоннымі або жывымі цяпер, але маглі быць жывымі тады (у т. л., штучна, дзякуючы, напрыклад, нейкай арфаэпіі), уваходзячы ў склад тагачаснай мовы і маўлення. Больш таго, пры такім (дыялектным) падыходзе атрымліваецца, што магістральныя кірункі развіцця нацыянальнай літаратурнай мовы ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу праходзілі праз зусім перыферыйныя помнікі ці творы, якія відавочна не маглі мець ні істотнага значэння, ні шырокага ўплыву. Тым не менш сцвярджаецца, што менавіта ў такіх помніках і тэкстах выпрацоўваліся нормы (ці стылі) будучай нацыянальнай літаратурнай мовы (у выпадку „руськай” – аж дзвюх: беларускай і ўкраінскай). У дадатак, даследчыкамі

[3] П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 148.
[4] Ф. Ткач, *op. cit.*, с. 67–68, 75.
[5] *Ibidem*, с. 72.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



часта адзначаецца наступная карэляцыя: чым больш малапісьменным або маладукаваным з'яўляецца аўтар/перапісчык, тым значнейшая ў яго мове доля дыялектных элементаў, і наадварот[6]. Парадаксальным чынам атрымлівалася, што складванне будучай нацыянальнай мовы залежала ад удзелу малапісьменных асоб ці няўважлівасці індывідаў. Праўда, такая выснова зусім не бянтэжыла даследчыкаў; здаецца, што яе парадаксальнасць імі нават не заўважалася, а калі заўважалася, то ігнаравалася.

Для правільнага разумення тагчаснай сітуацыі трэба прыняць пад увагу дзеянне сацыяльных чыннікаў і адмовіцца ад просталінейнага суаднясення маўленчай асновы даўняй кніжна-пісьмовай мовы з сучасным дыялектам. Такое суаднясенне, відаць, мела месца раней, у XI–XV стст.[7] Прыкладна да XVI ст. на Беларусі і Украіне (як і ў Польшчы ды Масковіі) панавала ўяўленне, што кніжна-пісьмовая мова можа існаваць галоўным чынам у царкве[8] (так працягвалі думаць у Масковіі аж да канца XVII ст.), і гэтай мовай у праваслаўных славян і румын была царкоўнаславянская (як у каталікоў – лацінская). Іншай дапушчальнай сферай ужытку кніжна-пісьмовай мовы ў тую эпоху з'яўлялася адміністрацыйна-канцылярская[9] – на Беларусі і Украіне выкарыстоўвалася ў гэтай сферы амаль выключна „руськая"[10]. Пры гэтым на думку некаторых даследчыкаў, „руськія" акты пісаліся „часто зовсім живою народною мовою"[11]. Таму ў XIV і ў большай частцы XV ст. ніякіх адметных помнікаў „руськай" мовы, апрача актавых і юрыдычных, даследчыкі не знаходзяць; гаворка наконт той эпохі ў лепшым выпадку ідзе пра фрагментарныя ўсходнеславянскія ўплывы ў помніках традыцыйнага царкоўнага пісьменства[12]. Аднак

---

6 П. И. Житецкий, *op. cit.*, с. 53; П. П. Плющ, *op. cit.,* с. 36.

7 В. М. Русанівський, *Народнорозмовна мова як джерело розвитку східнослов'янських літературних мов XVI – початку XVIII ст.*: Доповідь на VIII Міжнародному з'їзді славістів (Загреб – Любляна, вересень 1978 р.), Київ 1978, с. 4–5.

8 І. Огієнко, *Історія української літературної мови*, упоряд., передм., комент. М. С. Тимошик, Київ 2004, с. 146–147.

9 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст. і український Крехівський апостол 1560-х рр.*, т. 1. *Студії до української граматики*, кн. 7, Варшава 1930, с. 125–128.

10 Хаця ў Масковіі да XVII ст. таксама мелася ўласная адміністрацыйна-канцылярская мова (приказный язык) з некаторым дамешкам царкоўнаславянізмаў і генетычна звязаня з духавенствам (параўн. назвы маскоўскіх канцылярыстаў: „дз'як", „пад'ячы"), аднак яе ўжытак і сацыяльная база ў грамадстве ў цэлым былі слабейшыя параўнальна з „руськай" мовай у ВКЛ. Таму актавая мова Масковіі ледзьве заўважалася сучаснікамі і зрабіць адметны ўплыў на астатняе пісьменства сваёй краіны не магла. Таксама лацінская заставалася афіцыйнай мовай Польшчы да сярэдзіны XVIII ст., польская ж у гэтай функцыі выступала на Украіне і Беларусі (у асноўным у XVII–XVIII стст.), а ў самой Польшчы (з сярэдзіны XVI ст. і да пачатку XVIII ст.) ужывалася абмежавана, параўн. Z. Klemensiewicz, *Historia języka polskiego*, Warszawa 1974, s. 278, 500–501, 538. Там толькі сеймавая дакументацыя і некаторыя каралеўскія ўказы, звернутыя да шляхты, ствараліся з сярэдзіны XVI ст. на польскай мове, параўн. *Idem*, s. 275–276.

11 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 125.

12 Л. М. Шакун, *op. cit.*, с. 82–83.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



у гэтым выпадку відавочна, што пранікненне такіх уплываў абавязанае хутчэй недагляду ці няўважлівасці пісараў/аўтараў і ніяк не можа ўяўляць mainstream усяго пісьменства. Яго аснову (уласна літаратуру разам з тагачаснай навукай і адукацыяй) як у Заходняй Русі, так і ва Усходняй да XVI ст. складала царкоўнаславяншчына (у многіх помніках – у сваёй усходнеславянскай рэдакцыі). Адносна нязначнай была тады і доля твораў ды жанраў з больш паліятыўнай мовай (гэта ў асноўным летапісы): таксама з царкоўнаславянскай асновай, але з крыху больш значным дамешкам некаторых „руськіх" ці наогул усходнеславянскіх элементаў[13].

Аднак пад павевамі Рэнесансу (і здаецца, зусім не Рэфармацыі (як лічылі многія вучоныя[14], паколькі тэндэнцыі да гэтага адзначаюцца ўжо напрыканцы XV ст.[15] на Беларусі і Украіне паступова пашыраецца праніклая з Захаду новая ідэя: мова літаратуры і наогул пісьменства можа існаваць на жывой гутарковай аснове. Гэтай асновай стала тады, натуральна, не маўленне шырокіх народных колаў (сялянства, гарадской беднаты (плебса), пазней казацтва – у літаратуру ці наогул у пісьменства такое маўленне больш-менш адметна магло пранікнуць хіба што з эпохі рамантызму), а маўленне шляхты (і магнатэрыі). У XVI ст. узростае роля шляхты ў грамадстве: яна атрымлівае прывілеі і заканадаўча ды ментальна аддзяляецца ад ніжэйшых непрывілеяваных станаў (з якімі да таго была звязаная, бо рэкрутавалася адтуль), набліжаючыся да арыстакратыі, кансалідуецца і ператвараецца ў вядучую палітычную сілу феадальнай дзяржавы[16]. Яўна невыпадкова, што такі ўзлёт ролі шляхты суправаджаецца бурлівым развіццём „руськай" мовы: яна пранікае ў многія новыя сферы ды жанры і здабывае шырокі ўжытак у літаратуры. Нават у самой Польшчы развіццё шляхецкай дэмакратыі стала адным з важных чыннікаў росквіту польскай мовы ў XVI ст.[17] Аднак менавіта ў гэты час маўленне беларускай і ўкраінскай шляхты імкліва пазбаўляецца свайго ранейшага дыялектнага характару і заўважна набіраецца чужынных, а менавіта польскіх рыс, што выглядае для некаторых даследчыкаў бадай як стварэнне/узнікненне новай мовы[18]. Шляхецкае

[13] *Ibidem*, с. 110–113.

[14] П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 1–2; І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 19–59, 131, ср. прим. 3; *idem, Історія української літературної мови*…, Київ 2004, с. 147, 151; В. М. Русанівський, *Історія української літературної*…, с. 63.

[15] І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 19, 79–80.

[16] П. А. Лойка, Шляхта *беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст*., Мінск 2002, с. 3, 8–13, 30–33, 37–38; Н. Яковенко, *Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII століття: Волинь і Центральна Україна,* Київ 2008, с. 24–41, 45–52, 57–61.

[17] Z. Klemensiewicz, *op. cit*., s. 221.

[18] Адрозненне ў развіцці „рускай" кніжна-пісьмовай мовы (да XVI ст. і з XVI ст.) заўважалася многімі даследчыкамі (гл. напр. Ю. Шевельов, *Історична фонологія української мови*, перекл. з англ. С. Вакуленко, А. Даниленко. Харків 2002, с. 718–719, аднак тлумачылася па-рознаму, звычайна – як вынік стварэння новай кніжна-пісьмовай мовы, гл. П. И. Житецкий, *op. cit*., с. 1–3, 39–40; П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 130, 143, 147–148, 157–158, 166; Ю. Шевельов, *op. cit*., s. 719 – „простай" (чаму і навошта – звычайна заставалася без адказу), рад-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



маўленне на Беларусі і Украіне было прасякнута польскім уплывам, што і складае галоўную адметнасць ды спецыфіку гэтага маўлення.

Арыентацыя маўлення „руськай” шляхты менавіта на польскі ўзор абумоўлена хутчэй за ўсё тым, што яе палітычнае і юрыдычнае афармленне на Беларусі і Украіне адбывалася паводле паняццяў і прававых нормаў Польшчы, дзе шляхоцкі стан сфармаваўся раней, ужо ў XV ст.[19] Некаторыя даследчыкі кажуць пра прымусовую паланізацыю[20], аднак гэта сумнеўна нават для Украіны, куды перасяляліся польскія шляхта і пазней таксама сялянства[21] – такія даследчыкі хутчэй пераносяць на даўнюю эпоху лінгвістычныя практыкі і тэхналогіі XIX–XX стст. Больш падстаў лічыць, што паланізацыя адбывалася стыхійна (і таму далёка не татальна), у выніку ўдзелу ўсходнеславянскай шляхты ў польскай цывілізацыі[22], іншымі словамі – у публічным жыцці Рэчы Паспалітай (шляхецкай рэспублікі!), яе судова-прававой і палітычнай сістэме[23], а таксама ў культурных практыках. Мэтай утварэння Рэчы Паспалітай (магчыма, не ўсімі сучаснікамі асэнсаванай) было якраз і стварэнне адзінага шляхецкага народа, палітычнай нацыі (natio politico), гл. у дэталях[24]. Апошняя толькі гістарычна, аказіянальна набывала польскі выгляд, не столькі этнічны, колькі палітычны. У склад гэтай нацыі дабраахвотна маглі ўваходзіць прадстаўнікі іншых этнасаў ці канфесій (апошняе – звычайна да сярэдзіны XVII ст.), напрыклад, беларусы і ўкраінцы, праваслаўныя і ўніяты (натуральна, у сацыяльных адносінах – толькі шляхта і вышэйшае духавенства). Формулу такой нацыі прапанаваў яшчэ ў 2-й палове XVI ст. Станіслаў Арахоўскі: gente Rutheni, natione Poloni[25]. Няпольскія члены такой палітычнай нацыі мусілі з’яўляцца білінгвамі або дэманстраваць польскую афарбоўку свайго маўлення – апошняга, зразумела, дасягуць было нашмат лягчэй. Такім жа быў, відаць, і механізм русіфікацыі Левабярэжнай Украіны ў XVIII ст., скаргі на што тыповыя для

зей – як эфект народнага ўплыву, гл. I. Огієнко, *Історія української літературної мови…*, с. 151; В. М. Русанівський, *Народнорозмовна мова літературної…*, с. 9. Аналіз і крытыку поглядаў пра меркаванае стварэнне ў XVI ст. другой кніжна-пісьмовай мовы – „простай” – гл. І. Клімаў, *Да праблемы функцыянальнай стратыфікацыі старабеларускай мовы ў ВКЛ XIV–XVIII стст.*, [у:] „*Беларускі археаграфічны штогоднік*”, вып. 11, Мінск 2010.

19 П. А. Лойка, *op. cit.*, с. 3, 9, 18, 30–33, 4.

20 А. А. Москаленко, *До походження української писемної…*, с. 109; П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 141–142; І. Огієнко, *Історія української літературної мови…*, с. 147, 150–151, 166.

21 Н. Яковенко, *op. cit.,* с. 225–242.

22 D. A. Frick, *„Foolish Rus’”: On Polish civilization, Ruthenian self-hatred, and Kasijan Sakovyc*, „Harvard Ukrainian Studies” 1994, vol. 18, nr. 3–4, p. 212.

23 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 122–125, 134, 135.

24 Ю. Бардах, *Ад палітычных да этнічных народаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе*, [у:] *idem*, *Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага*, перакл. з польск. М. Раманоўскі, А. Істомін, Мінск 2002, с. 318–322.

25 D. A. Frick, *op. cit.*, p. 213.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



ўкраінскіх даследчыкаў[26]: мясцовыя ўкраінскія эліты імкнуліся ўдзельнічаць у новай расійскай цывілізацыі, як раней у польскай.

Іншамоўны (пераважна польскі) уплыў фіксуецца ў „руськіх" помніках ужо з канца XIV ст. (пераважна ў Заходняй Украіне[27], але доўга мае слабы характар, і толькі ў XVI ст. ён узмацняецца незвычайна, робіцца добра заўважным на пісьме. Вынікам гэтага становяцца шматлікія паланізмы на ўсіх моўных узроўнях – трэба думаць, што часткова, а, часам, магчыма, і ў значнай ступені яны належалі маўленню шляхты, а не народнай гаворцы. Працэс паланізацыі „руськага" пісьменства ў XVI–XVII стст. добра вядомы і адзначаецца ў самых разнастайных помніках і жанрах[28]. Ён праяўляецца нават нашмат пазней пасля таго, як палітычная ўлада польскай кароны над усходнеславянскімі землямі знікла[29] – напрыклад, на Левабярэжнай Украіне канца XVII – 1-й паловы XVIII ст. пад маскоўскай уладай[30] ці ў беларускіх помніках 2-й паловы XIX ст., калі царскія ўлады ў „Паўночна-Заходнім краі" распачалі змаганне з „паланізмам" (напрыклад, у беларускіх творах Ф. Багушэвіча)[31]. Гэта ясна сведчыць пра сацыяльна-культурныя стымулы да паланізацыі, не звязаная ні з палітычным прымусам, ні з наплывам этнічна польскага элементу.

Аднак далей, у прасталюд, такі польскі ўплыў не ішоў ці праходзіў даволі слаба[32] – пра гэта сведчаць сучасныя беларускія і украінскія дыялекты, за выключэннем гаворак у карпацкіх далінах і Галічыне – раёнах, якія да сярэдзіны XX ст. знаходзіліся пад інтэнсіўным заходнеславянскім уплывам; але нават там польскі ўплыў адзначаўся бадай толькі на самым памежжы[33]. Шлях польскаму ўплыву ніжэй, у народ, перапынялі значныя сацыяльныя (перш за ўсё класавыя) і культурныя бар'еры, што існавалі ў беларускім і ўкраінскім грамадстве да XVIII ст., а то і да канца XIX ст. Такой маўленчай спецыфікі не мела шляхта ў карэннай Польшчы і дваранства ў Масковіі/Расіі – там пануючыя класы былі аб'яднаныя са сваімі нізамі больш-менш адзінай мовай (галаманія славянскіх эліт XVIII–XIX стст. істотнага значэння для разглядаемых працэсаў не мае). Такога моўнага адзінства не было на Беларусі і Украіне, дакладней, яно разбурылася там каля XVI ст. у выніку ўзмацнення сувязяў эліт ВКЛ з Польшчай.

26 І. Огієнко, *Історія української літературної мови…*, с. 166, 170–180, 181–184, 189; В. М. Русанівський, *Історія української літературної…*, с. 126–132, 144–145, 147–148.

27 A. Martel, *La langue polonaise dans les pays ruthènes Ukraine et Russia Blanche: 1569–1667*, Lille 1938, s. 34–38; П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 132, 135, 137, 172.

28 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 119–120, 465–469; *idem*, *Історія української літературної мови…*, с. 147, 160, 186; A. Martel, *op. cit.*, s. 54–66, 92–169; І. С. Свєнціцький, *op. cit.*, с. 8–9; П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 170–171.

29 П. И. Житецкий, *op. cit.*, с. 44.

30 І. Огієнко, *Історія української літературної мови…*, с. 162, 165, 166.

31 І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч, *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*, т. 2, Мінск 1968, с. 88, 93–94, 95, 106–107.

32 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 118, 465, 470; A. Martel, *op. cit.*, s. 200.

33 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 118, 465, 466.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



Творцам даўняй кніжна-пісьмовай мовы Беларусі і Украіны з'яўлялася не толькі адна шляхта, але і іншыя ўпрывеліяваныя колы краіны, блізкія да шляхты ў генетычных ці сацыяльных адносінах. У асноўным гэта было д у х а в е н с т в а, прафесійна занятае ў ор. пісьмовай камунікацыі з даўніх часоў[34]. Яго вышэйшыя і сярэднія колы, як правіла, паходзілі з магнатэрыі і шляхты, тады як ніжэйшае духавенства і частка сярэдняга паходзілі з сацыяльных нізоў (з колаў, ніжэйшых за шляхту). Такія царкоўнікі нізкага сацыяльнага паходжання (як і іншыя падобныя да іх колы: заможнае мяшчанства, казацкая старшына, аднак іх роля ў дадзенай працы ігнаруецца, паколькі іх дачыненне да пісьменства было спарадычным), набываючы адукацыю ці пісарскі вопыт, пераходзілі на нейкі вышэйшы сацыяльны ўзровень і пачыналі (у масе) арыентавацца на шляхту („руськую" ці польскую), імкнучыся калі не зліцца з ёю, то хаця б наблізіцца да яе (перш за ўсё ў паводзінах, у т. л. і ў маўленні). Таму іх маўленне мусіла нівеліявацца, выгладжвацца пад уплывам і адукацыі (ці пісарскай практыкі), і больш прэстыжнага шляхецкага маўлення, якое асабліва імкнуліся засвоіць такія сацыяльныя ўзвышэнцы. Зразумела, што канчатковага нівелявання адбыцца не магло, і гэтыя parvenu ў той ці іншай ступені захоўвалі родныя дыялектызмы (у адваротнай залежнасці ад ступені сваёй адукаванасці ці пісарскай вопытнасці). Таму ў помніках, створаных царкоўнікамі з нізоў (ці з правінцыі), як і дробнай шляхтай, маглі заставацца сляды іх сацыяльна нізкага ці лакальнага паходжання, хаця звычайна даволі слабыя ці непаслядоўныя. Т. ч., духавенства было менш выразным носьбітам шляхецкага маўлення і разам з тым – важным мостам для пранікнення (праўда, спарадычнага) дыялектных рыс у пісьменства. Практычна ніводны помнік да XVIII ст. не мог быць створаны прадстаўніком нізкіх колаў грамадства, а таму і не мог адлюстроўваць народнае маўленне ў поўнай ступені. Дыялект заставаўся іх стыхіяй, але яны, будучы масава непісьменнымі, не маглі пакінуць пісьмовых помнікаў сваёй мовы[35].

Пра раз'яднанасць пануючых класаў Беларусі і Украіны з уласным народам, як і пра сацыяльнае ды маўленчае адзінства „руськіх" і, напрыклад, польскіх паноў пісалася яшчэ ў савецкія часы[36]. Ужо тады падкрэслівалася, што такая раз'яднанасць абумоўлена схільнасцю пануючых класаў да засваення заходніх моўных і пісьмовых з'яў, перш за ўсё польскіх[37]. Яшчэ раней, у дарэвалюцыйную эпоху, А. Сабалеўскі слушна падкрэсліваў, што „руская" мова не была „языком в с е г о

[34] Цікава, што з духавенствам частку шляхты яднаў менавіта пісьмовы занятак – і тым, і другім колам было ўласціва прафесійнае культываванне пісьменнасці. Паводле нормаў „руськага" права, у судова-адміністрацыйным апараце краіны з 1560-х гг. канцылярыстамі, адвакатамі і судовымі ўраднікамі маглі працаваць асобы толькі шляхецкай годнасці, і таму гэтыя пасады займала дробная і радзей сярэдняя шляхта, гл. Лойка, *op.cit.*, с. 32; Н. Яковенко, *op. cit.*, с. 257–259.

[35] В. Жирмунский, *Национальный язык и социальные диалекты*, Ленинград 1936, с. 34.

[36] Л. А. Булаховський, *Питання походження української мови*, Київ 1956, с. 29–30.

[37] *Ibidem*, с. 30.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



населения западной Руси; это был я з ы к в ы с ш е г о к л а с с а"[38] (вылучэнні належаць аўтару цытаты). Праўда, з тых часоў гэтая тэма так і не знайшла належнага працягу ў лінгвістычнай літаратуры.

З большай ахвотай даследчыкі казалі пра штучнасць „руськай" мовы, яе кніжную аснову[39], вылучаючы ў ёй больш кніжны (г. зн. царкоўнаславянскі) і больш дыялектны варыянты[40]. Пры гэтым часта падкрэслівалася тэндэнцыя ў гэтай мове адгарадзіцца ад жывой гаворкі[41]. Дарэчы тут было згадваць і традыцыяналізм „руськіх" пісараў ды „руськай" арфаграфіі[42]. Праўда, гэта не перашкаджала тым самым даследчыкам казаць пра набліжанасць „руськай" мовы да жывой гаворкі[43]. Гэтак удавалася ім спалучаць неспалучальнае, у лепшых традыцыях бальшавіцкай дыялектыкі: „вся тогочасна «мова», в основі своїй, була мовою книжною, досить далекою від народної розмовної […] мови, хоч і значно з нею зближеною"[44]. Інтуіцыйна адчуваную складанасць моўных і маўленчых рэалізацый даўняй эпохі даследчыкі доўга не маглі фармалізаваць у прымальныя і зразумелыя мадэлі ці механізмы.

Між тым, супярэчлівасці не ўзнікае, калі дапусціць існаванне ў „руськай" мове шляхецкага маўлення – спецыфічнай з'явы, якая адначасова была і штучнай, і жывой. Пры стварэнні пісьмовых тэкстаў беларускія і ўкраінскія вышэйшыя колы – шляхта і духавенства – арыентаваліся не на сялянскі дыялект (які цяпер вядомы даследчыкам), а на сваё маўленне, якое з XVI ст. непазбежна (хаця б у дэталях) ужо адрознівалася ад маўлення сацыяльных нізоў, перастала быць цалкам дыялектным. Маўленне шляхты на той момант апрыёрна мусіла складацца з элементаў двух тыпаў. Адны – гэта агульнанародныя, агульныя для нізоў і вярхоў (фактычна – гэта найбольш частотныя агульнаўсходне- і агульнаславянскія); менавіта такія элементы звычайна прызнаюцца сучаснымі даследчыкамі як гутарковыя ці народныя[45]. Другая частка элементаў паходзіла з вуснай і кніж-

---

[38] А. И. Соболевский, (рец.:) Е. Ф. Карский, *Обзор звуков и форм белорусской речи* (1885), „Журнал Министерства народного просвещения" 1887, ч. 251, с. 137.

[39] П. П. Плющ, *op. cit*., с. 36, 41, 143, 202–203, 206

[40] *Ibidem*, с. 36, 207–208.

[41] П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 3; П. П. Плющ, *op. cit*., с. 38–39.

[42] І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 231–232; П. П. Плющ, *op. cit*., с. 131, 140; Ф. Ткач, *До питання про характер української літературної мови*…, с. 73–74.

[43] П. П. Плющ, *op. cit*., с. 39, 143, 202.

[44] *Ibidem*, с. 157.

[45] *Ibidem*, с. 39, 131, 203, 205; Праўда, у лік гэтых народных, г. зн. дыялектных, элементаў даследчыкамі часам залучаюцца паланізмы ці этранжызмы, што трапілі да ўсходнеславянскіх моў праз пасрэдніцтва польскай. Так, В. Русаніўскі абвяшчае ўкраінскімі словамі паланізмы кшталту *мова*, *оздоба*, *праця*, *скарбъ*, *фарбований*, *погамувати*, *панувати*, *прудко*, гл. М. В. Русанівський, *Історія української літературної*..., с. 72, 106–107. Да побытавай лексікі, на яго думку, адносяцца такія „суто українські" словы і выразы даўніх помнікаў, як *бела голова* 'жонка', *будинокъ*, *палацъ*, *шпиталь*, гл. *Ibidem*, с. 106. Тэкст 1629 г. на тыповай „руськай" мове, насычнай фанетычнымі і семантычнымі паланізмамі на ўсіх моўных уз-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



най польскай мовы (як было сказана вышэй, яна ўспрымалася тады на Беларусі і Украіне перш за ўсё як мова шляхты Рэчы Паспалітай і толькі ўжо потым – як мова канкрэтнага этнасу ў гэтай дзяржаве)[46] і радзей – з кніжнай царкоўнаславянскай мовы. Канкрэтныя суадносіны першых і другіх элементаў у тым або іншым помніку збольшага дэтэрмінаваліся жанрам і тэматыкай твора ды схільнасцямі (у т. л. паходжаннем) і вопытам (у т. л. вучобай) яго аўтара[47].

Зразумела, што доля кніжных элементаў у штодзённым маўленні магла быць толькі нязначнай, але носьбіты такога маўлення маглі пры жаданні павялічваць гэтую долю на пісьме – асабліва калі яны належалі да духавенства ці апавядалі на рэлігійныя тэмы (гэта добра бачна на прыкладзе твораў Івана Вішанскага[48]. Таксама відавочна, што шляхта была схільная да ўжывання на пісьме паланізмаў і элементаў, агульных з польскай мовай (царкоўнаславянізмы маглі трапляцца пераважна ў рэлігійных кантэкстах), тады як духавенства на пісьме аддавала перавагу царкоўнаславянізмам і элементам, агульным з царкоўнаславянскай мовай. Але ў мэтах падкрэслення сваёй шляхецкасці яно магло павялічваць у сваім дыскурсе і долю паланізмаў – апошняе было асабліва тыпова для вышэйшага духавенства, якое часта паходзіла са шляхты ці было блізкім да яе. Аднак усе багацці сакавітай народнай гаворкі (якімі так пачалі захапляцца з эпохі рамантызму[49], былі, як правіла, закрытыя для гэтых працэсаў – з прычын сацыяльных і культурных бар’ераў, адзначаных вышэй[50]. Таму дастаткова слабыя (часта фрагментарныя) праявы дыялектнага маўлення назіраюцца практычна ва ўсім пісьменстве XVI – 1–й паловы XVIII стст.[51], нават у перыферыйных жанрах кшталту песень[52], што асабліва добра бачна ў помніках, запісаных лацінкаю, нягледзячы на ўсе размовы даслед-

роўнях, але пазбаўлены царкоўнаславянізмаў, даследчык абвяшчае напісаным „майже народною мовою”, г. зн. дыялектнаю, параўн. *Ibidem*, с. 116–117. Ён робіць гэта нават у дачыненні да вучоных твораў Іаанікія Галятоўскага, гл. *Ibidem*, с. 119.

46 Такое ўспрыманне польскай мовы было ўласціва не толькі няпольскім элітам Рэчы Паспалітай, але і суседніх дзяржаў – Малдовы XVI–XVII стст. і Масковіі XVII ст. Варта адзначыць, што гэтае паланафільства не залежала ад канфесійных і палітычных чыннікаў. Так, маўленне казацкай старшыны часоў Хмяльніччыны і Гетманшчыны напоўнена паланізмамі, нягледзячы на пагарду і нянавісць да напыхлівай польскай шляхты. Таксама добра вядома паланафільства маскоўскага цара і яго двара сярэдзіны XVII ст., хаця Польшча/ Рэч Паспалітая адназначна ўспрымалася ў тыя часы ў Масковіі як палітычны праціўнік, з якім неаднаразова вяліся войны. Т. ч., палітычныя бар’еры тады зусім не перашкаджалі свецкім і нават духоўным элітам захапляцца польскай мовай і культурай. Гэта сведчыць пра сімвалічную, сацыяльна-культурную ролю польскай мовы ў рэгіёне – аж да XVIII ст.

47 П. П. Плющ, *op. cit.*, с. 203.

48 *Ibidem*, с. 151–155.

49 І. Огієнко, *Історія української літературної мови*…, с. 110–115.

50 Даследчыкі слушна гавораць пра адарванасць ад простага народа нават такіх асоб, як Іван Вішанскі і Захар Капысценскі, вынікам чаго была іх варожасць да народнай мовы, гл. П. И. Житецкий, *op. cit.*, с. 147–148, 151; І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 99.

51 П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 138–140.

52 В. М. Русанівський, *Історія української літературної…*, с. 148.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



чыкаў наконт „пашырэння народнай асновы" і „дэмакратызацыі кніжнай мовы". Калі б гэта сапраўды мела месца, то ўжо ў XVII–XVIII стст. „рускае" пісьменства спрэс (а не толькі ў маўленчых характарыстыках простанародных персанажаў камедый і інтэмедый) мусіла б зрабіцца дыялектным, чаго ў сапраўднасці не было.

Натуральна, гэтую акалічнасць спрабавалі вытлумачыць кансерватызмам пісьма, сакральным характарам кніжнасці ці дыстанцыяй паміж вуснасцю і пісьмовасцю (orality and writness). Але ж гэтае пісьмо і кніжнасць у той самы час (і часта ў тым самым помніку) зусім не перашкаджалі адлюстраванню іншых з'яў, зусім не ўсходнеславянскіх (і таму дастаткова нетрадыцыйных), – напрыклад, тых, што ўваходзілі ў склад шляхецкага маўлення (гл. ніжэй). У дадатак яго рысы яшчэ і нестабільна ды непаслядоўна праяўляліся на пісьме, чаму можна думаць, што яны, па меншай меры часткова, былі звязаныя з вуснай формай існавання. Гэтае маўленне трэба разумець як набор (не заўжды стабільны і сталы) аўтарытэтных маўленчых узораў ці мадэляў, якіх карыстальнікі імкнуліся прытрымліваецца перш за ўсё ў прэстыжных ці прэцэдэнтных камунікацыйных сітуацыях (асабліва на пісьме). Такі набор выглядае як нейкі сацыялект – маўленчыя асаблівасці, уласцівыя пэўнай сацыяльнай групе (ці групам), – але магчыма, уяўлялі сабой толькі моўную афарбоўку гэтай групы. Варта адзначыць, што і сама шляхта была вельмі неаднародная ў культурных, палітычных і эканамічных адносінах[53], і многія правінцыйныя канцылярысты, адвакаты ці дробнае духавенства (асабліва ў т. зв. глухіх кутках) не заўжды маглі атрымаць досяг да польскіх маўленчых ўзораў, скласці дастаткова поўнае ўяўленне пра іх. Верагодна, у такой сітуацыі трэба весці гаворку пра нейкую ўсвядомленую маўленчую з'яву, кшталту культурнай звычкі ці практыкі, свайго роду, культуру мовы тых часоў.

Ідэя пра наяўнасць у даўнія часы нейкага культурнага ці культываванага маўлення далёка не новая, яе раней выказвалі асобныя вучоныя. П. Жытэцкі тлумачыў узнікненне „рускай" мовы збліжэннем „с обыкновенною разговорною речью грамотных, «письменныхъ» людей"[54], а пранікненне паланізмаў – „путем школы, путем общественных влияний"[55]. І. Агіенка лічыў „рускую" мову сродкам зносін мясцовай русінскай інтэлігенцыі, толькі насычанай запазычаннямі, незразумелымі народу[56]. Ён падкрэсліваў ролю інтэлігенцыі ў тварэнні і развіцці „рускай" мовы[57], разумеючы пад гэтай інтэлігенцыяй тагачасных пісьменнікаў – і царкоўнікаў, і шляхту[58], апошняя была, зразумела, „вища інтелігенція"[59].

Рысы гэтага шляхецкага маўлення, здаецца, ніколі не разглядаліся ў сваёй сукупнасці, як нейкае адзінства. Звычайна яны аналізаваліся толькі паасобку, як

53 П. А. Лойка, *op. cit.*, с. 12–13, 18–21; Н. Яковенко, *op. cit.*, с. 24–35, 59–61, 69.

54 П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 39.

55 *Ibidem*, с. 51.

56 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 135.

57 *Ibidem*, с. 119–120, 131–135, 464, 466.

58 *Ibidem,* с. 132.

59 *Ibidem*, с. 133, 134–135.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



не звязаныя паміж сабой і, у дадатак, ім заўжды імкнуліся даць дыялектнае, а не сацыялінгвістычнае тлумачэнне. Аднак непаслядоўнасць і адначасова шырокая рэпрэзентацыя гэтых рыс ў самых разнастайных помніках розных жанраў, рознага месца паходжання і часу ўзнікнення не дазваляе звязваць з уплывам таго ці іншага дыялекта. Пэўны дыялект як сялянскае ўтварэнне не мог пакінуць такога значнага следу гэтак далёка ад арэалу свайго распаўсюджання ды яшчэ ў кніжных тэкстах, аўтарамі якіх у даўнія часы звычайна былі прадстаўнікі вышэйшых колаў грамадства. Такі дыялектны ўплыў, калі б ён сапраўды меў месца, не мог абмежавацца толькі адной-дзвюма рысамі, а мусіў пакінуць сляды на розных моўных узроўнях, чаму прыкладаў у помніках звычайна няма. Таму застаецца прыпісваць такія рысы менавіта асабліваму шляхецкаму маўленню.

Пакуль склад рыс гэтага маўлення не да канца ясны, і таму прапанаваны ніжэй спіс далёка не канчатковы (і, натуральна, не бясспрэчны). Тым не менш пэўны моўны матэрыял усё ж магчыма сабраць, і ён дазваляе аднесці да шляхецкага маўлення наступныя рысы:

## 1. Фанетычныя з’явы

1.1. „Руськае” „еканне”: частае (але амаль заўжды непаслядоўнае!) выкарыстанне *е* на месцы былога прасл. **ę* (як правіла, у ненаціскным становішчы): *кнежати*, *месеца*, *памети*, *тисеча*; *девети*, *десетъ*/*десети*, *светого*, *присегати се*, *огледалъ*, *мовечи*, *ходечи*, *водле*, аднак часам і на іншых месцах – пасля [j]: *поесъ*/*поеса*, *приетелъ* (у т. л. і пад націскам: *дле* ‘для’, *себръ* ‘сябар’) і нават у запазычаннях: *до плецу* ‘пляц’/*полплецу*, *октебря* і інш.[60]

Украінскія даследчыкі часам прыпісваюць гэта ўплыву палескага дыялекта[61], аднак гістарычна гэта немагчыма: палескія гаворкі не адыгрывалі істотнай ролі ў гісторыі „руськай” мовы XVI–XVII стст., калі ўласна і праяўляецца гэтая рыса, у дадатак, гэтыя гаворкі і самі вельмі неаднастайныя ды нават нестабільныя паводле сваіх структурных рыс, таму гэтая з’ява там трапляецца лакальна і далёка неаднародная[62]. Дыялектна гэтая з’ява сустракаецца ў больш шырокім арэале, не выключаючы і беларускага[63].

[60] П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 140–141; Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа*, вып. 1, ред. В. И. Борковский, Москва 1955, с. 104–108; М. А. Жовтобрюх, В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *Історія української мови: Фонетика*, Київ 1979, с. 294–295.

[61] І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 248–252; *idem*, *Історія української літературної мови…*, с. 142; Ю. Шевельов, *op. cit*., с. 183–185.

[62] І. Клімаў, *Да пытання пра палескі тып у супольнай літаратурна-пісьмовай мове беларусаў і ўкраінцаў XIV–XVIII стст*., [в:] *Волинь – Житомирщина: Історико-філологічний збірник з регіональних проблем*, № 22 (1), Житомир 2010.

[63] *Нарысы па беларускай дыялекталогіі*, рэд. Р. І. Аванесаў, Мінск 1964, с. 65–66; М. А. Жовтобрюх, В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *op. cit*., с. 293–297.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



1.2. „Руськае” „вуканне”: выкарыстанне *у* / *ю* для перадачы [о]/[’о] ~ [’е] у закрытых складах (таксама далёка не паслядоўна): *грумъ* ‘гром’, *двуръ* ‘двор’, *ругъ* ‘рог’, *суль*, *торгувникъ*; *pułtorasta*, *z hur* ‘з гор’[64]; *слувъ*, *домувъ*, *свуй*, таксама (відаць, паводле аналогіі) і пасля мяккіх зычных: *гандлювникъ*, *завюлъ*, *занюслъ*, *кролюмъ*, *о всюмъ*, *Василювъ* і інш.[65]

Украінскія даследчыкі адзінадушна кваліфікуюць гэта праявам украінскага маўлення[66] ці палескай гаворкі[67], аднак гэта малаверагодна – на фоне слабой ці спарадычнай прадстаўленнасці ў гэтых самых помніках іншых дыялектных рыс (украінскіх ці толькі палескіх). Такое звужэнне ў закрытых складах адзначаецца ў розных палескіх і радзей галічанскіх (наддністранскіх) і некаторых карпацкіх гаворках, але непаслядоўна і з многімі фанетычнымі варыянтамі[68]. Ва ўкраіністыцы такія галосныя называюцца неаднароднымі (ці дыфтонгамі), аднак у помніках гукі на іх месцы перадаюцца амаль выключна праз *у*/*ю*[69], хаця пры дыялектным генезісе з’явы трэба было б чакаць у помніках разнастайных графічных перадач. Існуе таксама разыходжанне паміж лакалізацыяй дадзенай фанетычнай з’явы ў канкрэтным украінскім дыялекце і яе рэпрэзентацыі ў пісьмовых помніках. Хаця такое звужэнне ўласціва пераважна палескім гаворкам, перш за ўсё усходнім, але на пісьме „вуканне” адлюстроўвалася пераважна ў заходнеўкраінскіх помніках[70], а таксама ў малдаўскіх актах[71]. Падобнае звужэнне спарадычна заўважалася Е. Раманавым у жывым маўленні нават ва Усходняй Беларусі яшчэ напрыканцы XIX ці напачатку XX ст.: *комнутку*, *ён вырвув*, *разгулюйся*; *руўненько*, *намуўляў*, *паклонуў ні дае*[72], яшчэ часцей такое маўленне рэгістравалася тады ж у заходняй і паўднёвай частцы Беларусі: *у чыстум полі*, *на гэтум свеці*, *на жоўтум пяс(у)очку*; *у гэтуй*, *на туй*, *у новуй хаце*; *покуй* ‘пакой’, *хуць* ‘хоць’, *гуд* ‘год’, *буг* ‘бог’, *друмны* ‘дромны’, *яблунь*, *тулькі*, *вунь*, *жунка* ‘жонка’ і пад.[73]. Тое ж пацвярджаюць і больш новыя запісы[74].

64 L. Citko, *„Kronika Bychowca” na tle historii i geografii języka białoruskiego*, Białystok 2006, c. 58.
65 М. А. Жовтобрюх, В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *op. cit*., с. 275.
66 Л. А. Булаховський, *op. cit*., с. 54–55, 196–197; В. М. Русанівський, *Історія української літературної...,* с. 91.
67 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 253–260; В. М. Русанівський, *Історія української літературної...,* с. 138, 143–144
68 Ф. Т. Жилко, *Нариси з діалектології української мови*, Київ 1966, с. 35, 42–50, 151–153, 160, 167, 171; М. А. Жовтобрюх., В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *op. cit*., с. 276–277.
69 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 255.
70 Ф. Т. Жилко, *op. cit.,* с. 16, 18, 19; М. А. Жовтобрюх, В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *op. cit*., с. 273–274.
71 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 259–260.
72 Е. Ф. Карский, *op. cit.,* с. 113, 118.
73 *Ibidem*, с. 119–120.
74 *Нарысы па беларускай дыялекталогіі*, с. 77–79, 88, 90

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



1.3. Асобныя арфаэпічныя з'явы, напрыклад:

1.3.1. Т. зв. сярэднееўрапейскі [l], уласцівы польскай і чэшскай мовам, што, відаць, прыводзіла да хістанняў пры перадачы на „руськім" пісьме лацінізмаў і германізмаў: *ляментъ/ламентъ*, *лямпа/лампа*, *плянета/планета*, *обшлягъ/обшлагъ*, *пляцъ/плацъ* (гл. у дэталях)[75].

1.3.2. Наяўнасць выбухнога [g] (пры захаванні і фрыкатыўнага [γ]), што спрыяла ўжыванню на пісьме дыграфа *кг* ці спецыяльнай літары *ґ*, звычайна ў паланізмах і лацінізмах (гл. у дэталях)[76].

1.3.3. Мяккасць -*н*'- перад некаторымі суфіксальнымі зычнымі і ў асобных запазычаннях: *паньство*, *паньский*, *виленьский*, *женьский*, *набоженьство*, *коньца*, *аньгела*[77].

1.3.4. Адсутнасць падаўжэння зычных (у асноўным у назоўніках ніяк. р.): *выполненя*, *мовеня*, *приказаня* (хаця гэта магла быць толькі факультатыўная норма, паралельная іншым магчымасцям – з падаўжэннем (*веселля*), як у дыялектах, ці з захаваннем [j], на царкоўнаславянскі ўзор: *приказанья*[78].

1.4. Ужыванне ў абмежаванай лексіцы гукаў [xv] ([x]) замест [f] ці [f] замест [xv], што прыводзіла да хістання на пісьме літар *хв/ф*: *фала/хвала*, *фороба/хвороба*, *фостъ/хвостъ* (адкуль бел. *Хойнікі*, укр. *Фастів*); яны ўяўляюць сабой не нейкія фанетычныя анамаліі ці дыялектныя з'явы, а прамыя запазычанні з польскай мовы (гл. у дэталях[79]).

## 2. Марфалагічныя з'явы

2.1. Некаторыяканчаткі назоўнікаў:

2.1.1. Канч. -*у*/-*ю* ў форме Р. скл. адз. л. назоўнікаў, што пазначаюць пабудовы ці вырабы (г. зн. канкрэтныя прадметы, якія звычайна маюць тут канч. -*а*/-*я*[80]: *зъ/до дому*, *гробу*, *замку*, *мосту*, *храму* і інш.[81]

2.1.2. Канч. -*увъ*/-*ювъ* у форме Р. скл. мн. л. назоўнікаў муж. р., пераважна іншамоўных ці агульных з польскай мовай: *панувъ* (< п. *panów*), *блудувъ* (< п. *błędów*), *замкувъ* (< п. *zamków*), *капланувъ* (< п. *kapłanów*), *обычаювъ* (< п. *obyczajow*), *звы-*

75 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 513–514; І. Клімаў, *Адаптацыя спецыфічных польскіх зычных у паланізмах старабеларускіх помнікаў*, [у:] *Паланістыка = Полонистика = Polonistyka: 2009*, рэд. А. Кіклевіч, С. Важнік, Мінск 2010, с. 47–49:

76 І. Клімаў, *Адаптацыя спецыфічных польскіх зычных…*, с. 50–51.

77 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 216–217, 295–296, 309; І. Клімаў, *Адаптацыя спецыфічных польскіх зычных…*, 2010, с. 47–49

78 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 218, 317–318, 327.

79 *Ibidem*, с. 516; І. Клімаў, *Адаптацыя спецыфічных польскіх зычных…*, с. 52–55.

80 І. М. Керницький, *Система словозміни в українській мови на матеріалах пам'яток XVI ст.*, Київ 1967, с. 26–27.

81 *Ibidem*, с. 32.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



*чаювъ* (< п. *zwyczajow*), што пераносілася і на іншыя ўсходнеславянскія словы, якія не мелі структурнай (марфемнай) адпаведнасці польскім словам – відаць, паводле аналогіі[82]: *отцувъ*, *князювъ* і пад.; асабліва гэта ўласціва кніжнай ці запазычанай спецыяльнай лексіцы: *фрасункувъ*, *рахункувъ*, *цырокграфувъ* і інш. Сапраўды, калі польскія канчаткі ў такіх формах даўней „читалися фонетично як -*ów*; чому не могло бути такого звичаю і в письменстві" „руськім"?[83]

Такія канч. -*увъ*/-*ювъ*, здаецца, больш тыповыя для пісьменства Украіны, дзе яны ўласцівыя галіцкім і малдаўскім помнікам[84], але зрэдку яны адзначаюцца і ў беларускіх помніках, асабліва напісаных лацінкай: *zubrów*, *Wileńców*[85]. Спарадычна яны фіксаваліся яшчэ напрыканцы XIX ці напачатку XX ст. у жывым маўленні нават на ўсходзе Беларусі (напрыклад, Е. Раманавым): *приехуў*, *разгневуўся*[86], і тым больш тыповыя яны былі тады для захаду і поўдня: *братюв*, *сёструв*, *дядкув* і г. д.[87]

2.2. Энклітычныя формы *ми*, *ти*, радзей *си* (Д. скл.), *мя* (*ме*), *тя* (*те*), *ся* (*се*) (В. скл.) асабовых і зваротнага займеннікаў; такія формы ўласцівыя зараз паўднёва-заходняму дыялекту ўкраінскай мовы[88] і толькі спарадычна яны фіксаваліся ў Беларусі на мяжы XIX–XX стст.[89]

2.3. Усечаныя формы займеннікаў 3-й асобы (указальных займеннікаў у функцыі асабовых): *го*, *му* замест усхсл. *его*, *ему*; такія ўсечаныя формы адзначаюцца ў паўднёва-заходнім дыялекце ўкраінскай мовы, дзе лічацца інавацыяй, што ўзнікла паводле аналогіі[90].

2.4. Паралельная форма складанага (аналітычнага) будучага часу *буду писалъ* < п. *będę pisał* пры больш тыповым для ўсходнеславянскіх моў *буду писати* (у польскай мове формы з інфінітывам кшталту *będę pisać* пачалі занепадаць з канца XVI ст., але трымаліся аж да XIX ст.[91]

Такія формы (кшталту *буду писав*) зараз уласцівыя толькі паўднёва-заходняму дыялекту ўкраінскай мовы[92], дзе яны цалкам паралельныя ў сваім ужытку аналітычным формам будучага часу з інфінітывам (кшталту *буду писати*). У даўнім пісьменстве Украіны гэтыя -*л* формы аналітычнага будучага часу часцей сустракаюцца ў галічанскіх і карпацкіх вучыцельных евангеллях, а ў іншых

---

82 *Ibidem*, с. 95.
83 І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 333.
84 І. М. Керницький, *op. cit.*, с. 95.
85 L. Citko, *op. cit.*, с. 58.
86 Е. Ф. Карский, *op. cit.*, с. 112.
87 *Ibidem*, с. 120.
88 Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 85, 184–185, 200; С. П. Бевзенко, *Історична морфологія української мови: (Нариси із словозміни та словотвору)*, Ужгород 1960, с. 152–153.
89 Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа*, ред. В. И. Борковский, вып. 2–3, Москва 1956, с. 191–192.
90 Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 86.
91 Z. Klemensiewicz, *op. cit.*, s. 620.
92 Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 101–102, 187, 201, 222, 238; І. М. Керницький, *op. cit.*, с. 231.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



помніках Украіны рэдкія[93]. У беларускіх гаворках такія формы фіксаваліся толькі на самым захадзе краіны на мяжы XIX–XX стст. і прыпісваліся польскаму ўплыву[94], хаця ў даўніх помніках Беларусі гэтыя формы далёка не рэдкасць[95]. Там яны таксама звязваюцца толькі з польскім уплывам[96], хаця адзначаны нават у летапісах[97] і трапляюцца аж у старарускіх помніках да XVI ст.[98] Аднак украінскія даследчыкі падобныя формы ў цяперашніх заходнеўкраінскіх гаворках лічаць архаізмамі[99], нават не дапушчаючы думкі пра іх польскае паходжанне[100].

2.5. Спецыфічныя асабовыя формы дзеяслова прошлага часу (т. зв. прошлы асабовы час) у 1–й і 2–й ас. адз. і мн. л.: *ходилемъ*/*ходиломъ*/*ходиламъ*, *ходилесь*, *ходилисмо*, *ходилисте* (< п. *chodziłem*/*chodziłam*, *chodziłeś*, *chodziliśmo*, *chodziliście*); тое ж тычыцца і аднаструктурных формаў даўномінулага часу (*былемъ/быломъ казалъ* < п. *byłem kazał*) і ўмоўнага ладу (*былъ бы(ло/ле)мъ казалъ* < п. *był byłem kazał*), у склад якіх уваходзіць такая форма асабовага прошлага часу; пры гэтым яе асабовыя канчаткі могуць выступаць самастойна (у т. л. у прэпазіцыі), далучаючыся ў выглядзе клітыкаў да іншых слоў (у асноўным злучнікаў): *жесмо не были годны* і пад.

Такія дзеяслоўныя формы адсутнічаюць у іншых усходнеславянскіх дыялектах (і ніколі не адзначаліся, напрыклад, у наўгародскім ці маскоўскім рэгіёне), але ўласцівыя польскай мове. Яны таксама распаўсюджаны ў паўднёва-заходнім дыялекце ўкраінскай мовы і яе палеска-валынскіх гаворках (*ходивем*, *ходивесь*, *ходилисмо* і г. д.), дзе, аднак, цалкам паралельныя звычайным формам прошлага часу, што не маюць асабовых канчаткаў (*ходив*, *ходила*, *ходили* і г. д.)[101]. Украінскія даследчыкі тлумачаць наяўнасць такіх асабовых формаў толькі як архаізм, захаванне рыс папярэдніх этапаў развіцця мовы[102], аднак гэта здаецца занадта катэгарычным: польская мова магла садзейнічаць узнікненню такіх формаў[103]. Ва ўсялякім выпадку, такія дзеяслоўныя формы шырока адзначаюцца ва ўсім „русь-

93 П. И. Житецкий, *op. cit.,* с. 71; І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 387; І. М. Керницький, *op. cit*., с. 231–233.
94 Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа* (*вып. 2–3*)…, с. 288–289.
95 *Ibidem*, с. 258; А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі, *Гістарычная марфалогія беларускай мовы*, Мінск 1979, с. 259–262; А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко, У. М. Свяжынскі, *Мова беларускай пісьменнасці XVI–XVIII стст*, Мінск 1988, с. 187–189.
96 А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі, *op. cit*., с. 262.
97 L. Citko, *op. cit*., с. 169, параўн. А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко, У. М. Свяжынскі, *op. cit*., с. 188.
98 L. Citko, *op. cit*., с. 169.
99 С. П. Бевзенко, *op. cit*., с. 328–329; Ф. Т. Жилко, *op. cit*., с. 101.
100 П. И. Житецкий, *op. cit*., с. 71.
101 Ф. Т. Жилко, *op. cit*., с. 100–101, 186–187, 201; І. М. Керницький, *op. cit*., с. 204–205.
102 П. И. Житецкий, *op. cit*., с. 48–49; С. П. Бевзенко, *op. cit*., с. 312; Ф. Т. Жилко, *op. cit*., с. 174.
103 Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа* (*вып. 2–3*)…, с. 285.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



кім" пісьменстве – не толькі на Украіне[104], але і на Беларусі[105], хаця ў беларускіх і ўсходніх украінскіх дыялектах адпаведнікі ім зараз не вядомыя. Паказальна, што ў помніках з Украіны ў XIV–XV стст. такія формы практычна не фіксуюцца, тады як ў помніках XVI–XVII стст., у т. л. актавых, іх ужо шмат[106].

Пра пэўную штучнасць формаў прошлага асабовага часу, іх недыялектны генезіс у „руськім" пісьменстве сведчаць паралельныя ўтварэнні з -*о*- (а не толькі з -*е*-) у канчатку 1–й і 2–й ас. адз. л. муж. р.: *подаломъ*, *умыслиломъ*, *виделомъ*/*ввошолось* (у Цяпінскага і г. д.[107] Такія формы немагчымыя ў сістэме заходнеўкраінскіх гаворак, дзе для муж. р. адзначаны толькі ўтварэнні з пярэднім галосным – для 1–й ас. канч. -*ім*/-*ем* (< *jem* < *jeśm*): *ходив'ім*/*ходивем*; для 2–й ас. канч. -*іс*/-*ес* (< *jeś* < *jesteś*): *ходив'іс*/*ходивес*, а формы з -*о*- там суадносяцца толькі з ніяк. р.[108] Тая ж асаблівасць звязаная і з формай 1–й ас. мн. л., дзе ў „руськім" пісьменстве апрача канч. -*смо* (-*смы*) сустракаецца і канч. -*хмо* (-*хмы*, менш паказальны), даволі часты ў беларускіх помніках[109] і вядомы галічанскім ды малдаўскім помнікам[110], без прамой адпаведнасці ў дыялекце – карпацкім гаворкам украінскай мовы на яго месцы вядомыя толькі ўтварэнні з -*с*-: *ходилисмо*, *ходилисме*, *ходилисму* і пад.[111] Формы з -*х*- прызнаюцца кніжнымі наватворамі[112], аднак іх можна прыпісваць і шляхецкаму маўленню.

## 3. Сінтаксічныя з'явы

3.1. Уніканне зборных лічэбнікаў (за выключэннем лічэбнікаў *оба(два)*/*обе(две)*; катэгорыя зборнасці не склалася ў польскай мове) за кошт канструкцый з колькасным лічэбнікам і назоўнікам або займеннікам у форме Р скл. мн. л.: *тыхъ было трохъ* (замест *трое*) такія канструкцыі ўласцівыя паўднёва-заходняму дыялекту ўкраінскай мовы[113], але таксама і захаду Беларусі[114].

[104] П. И. Житецкий, *op. cit.*, с. 134; І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 376–377; І. М. Керницький, *op. cit.*, с. 202–204, 205, 208, 214–216.
[105] Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народ*а (вып. 2–3)…, с. 285; А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі, *op. cit.*, с. 231–236; А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, І. І. Крамко, У. М. Свяжынскі, *op. cit.*, с. 190–195.
[106] С. П. Бевзенко*, op. cit.*, с. 311–312.
[107] А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі, *op. cit.*, с. 236.
[108] Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 100, 186, 201; І. М. Керницький, *op. cit.*, с. 204–205.
[109] А. І. Жураўскі, *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы*, ч. 1, Мінск 1967, с. 293; А. М. Булыка, А. І. Жураўскі, У. М. Свяжынскі, *op. cit.*, с. 234–235.
[110] І. М. Керницький, *op. cit.*, с. 215.
[111] Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 100, 186, 201.
[112] А. І. Жураўскі, *op. cit.*, с. 293.
[113] Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 112, 188–189.
[114] *Нарысы па беларускай дыялекталогіі*, с. 304.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



3.2. Дыстантнае (у т. л. у прэпазіцыі) размяшчэнне зваротнага фарманта *ся* (параўн. п. *się*) адносна дзеяслова[115]: *на што ся надеешъ*; *штобы ся стало*; *того ся злученя го зъ козаками* і пад.; такі ўжытак уласцівы паўднёва-заходняму дыялекту ўкраінскай мовы, натуральна, побач з сістантным размяшчэннем[116], аднак дыстантнае размяшчэнне фарманта зрэдку адзначалася раней таксама ў народным маўленні і на Беларусі[117].

3.3. Даволі частае выкарыстанне ў іменным выказніку дзеяслоўнай звязкі ў форме цяперашняга часу адз. і мн. ліку: *Богъ есть добрый*; *которые сутъ пожитки* і пад.

Можна адзначыць таксама некаторыя акцэнтныя асаблівасці (хаця яны абмежавана могуць быць пацверджаныя пісьмовым матэрыялам) – усталяванне аднамесцавага націску ў многіх словах і формах на перадапошнім складзе, як у польскай мове: *зáконъ*, *зáказъ*, *зáходъ*, *зéмный*[118], *дéкретъ*, *нáпасть*, *нáродъ*, *пíсмо*[119], *мóго*, *твóго*/*твéго* і да т. п. Польскі акцэнтны ўплыў наяўнічае таксама ў дзеясловах. На першы погляд, націск у многіх з іх падае на трэці склад ад канца (*кáрати*, *стáратися*, *стéрпети* і інш.[120], г. зн. не так, як у польскай мове. Аднак у даўняй кніжна-пісьмовай мове фіналь *-ти* часта з'яўлялася толькі пісьмовай умоўнасцю, бо галосны ў ёй страчваўся[121], таму і ў гэтым выпадку мела месца польская акцэнтная мадэль.

Большасць з прыведзеных рыс украінскія даследчыкі спрабуюць вытлумачыць як архаізмы або лакалізмы, што рэалізоўвалі некаторыя тэндэнцыі дагістарычных часоў (асабліва 1.3.3, 2.2, 2.4–2.5, 3.2). Аднак, як было паказана, сляды многіх такіх рыс адшукваюцца і ў беларускім арэале (у гаворках і/ці ў даўніх помніках), у сувязі з чым немагчыма казаць пра іх выключна ўкраінскі характар[122]. Таксама і выключна дыялектнае паходжанне саміх гэтых рыс здаецца сумнеўным. Большасць з іх – гэта паланізмы, што пранiклі на ўсходнеславянскі абшар дзякуючы як беларуска- ці ўкраінска-польскаму білінгвізму вышэйшых колаў грамадства (заможнай шляхты і вышэйшага духавенства), так і польскай афарбоўцы іх маўлення (у выпадку дробнай шляхты і ніжэйшага духавенства). Важна падкрэсліць, што прыведзены вышэй спіс – гэта не сінгулярныя запазычанні, а цэлы набор рыс, якія шырока праяўляліся не толькі ў іншамоўнай, але і ва ўсходнеславянскай лексіцы, і выступалі часта разам (радзей фіксуюцца хіба

[115] П. И. Житецкий, *op. cit.*, с. 71–72; І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст…*, с. 430–432.
[116] Ф. Т. Жилко, *op. cit.*, с. 188, 201–202, 238.
[117] Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа* (*вып. 2–3*)…, с. 192.
[118] Е. Ф. Карский, *Белорусы: язык белорусского народа* (*вып 1*)…, с. 399–400.
[119] А. І. Жураўскі, *op. cit.*, с. 286.
[120] *Ibid.*
[121] *Ibidem*, с. 291.
[122] А. А. Москаленко, *Про утворення мови української народності і нації…*, с. 139; Ф. Ткач, *op. cit.*, с. 69.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



што 2.3 і 3.1) у самых розных (жанрава, тэматычна) помніках з розных абшараў (беларускіх і украінскіх, заходніх і ўсходніх) і ў розныя перыяды „рускага" пісьменства, звычайна ў XVI–XVII стст. Гэта – выразная прыкмета сацыялінгвістычнай, а не дыялектнай з'явы. Паказальна, што такія рысы яшчэ слаба прадстаўлены ў выданнях Ф. Скарыны – відаць, з-за таго, што асветнік не паходзіў са шляхецкага стану, а таму і не мог адлюстраваць іх ў поўнай ступені ў сваіх тэкстах. Таму ўсе спробы даць падобным рысам дыялектнае тлумачэнне (цалкам ці хаця б часткова) застаюцца няўдалымі і бясплённымі[123].

На ролю ўніверсальнага інтэрпрэтацыйнага фону для гэтых рыс амаль заўжды трапляе паўднёва-заходні дыялект украінскай мовы, перш за ўсё яго карпацкія (лемкаўскія і бойкаўскія) і наддністранскія гаворкі. Аднак здаецца, што прычына гэтаму – трывалы і працяглы кантакт гэтых гаворак з суседнімі заходнеславянскімі дыялектамі і асабліва з польскім маўленнем, якое з'яўлялася высокапрэстыжным і было даволі пашырана ў гэтым рэгіёне аж да сярэдзіны XX ст. Астатнія ўкраінскія і амаль усе беларускія гаворкі страцілі такі кантакт, адпаведна, з сярэдзіны XVII ст. ці з канца XVIII ст., калі амаль усе беларускія і большасць украінскіх земляў апынуліся ў складзе Расійскай імперыі. Таму можна меркаваць, што яны згубілі асаблівасці, якія больш выразна і трывала захаваліся ў Прыкарпацці і наогул у Заходняй Украіне. Для некаторых даследчыкаў гэта выглядае як уплывовасць заходнеўкраінскага варыянта „рускай" мовы[124], бо нават універсалы Багдана Хмяльніцкага прызнаюцца напісанымі на народнай аснове паўднёва-заходняга дыялекта ўкраінскай мовы[125]. Аднак гэта, відаць, даследчыцкая аберацыя: апрача паланізмаў (апісаных вышэй у складзе шляхецкага маўлення) іншыя сляды гэтага дыялекту за яго межамі фактычна адсутнічаюць. Т. ч., падобныя паланізмы звязваюцца з заходнеўкраінскім арэалам толькі таму, што яны зараз там прадстаўлены. Але раней сітуацыя магла быць інакшай.

Можна прывесці і некаторыя сведчанні наконт таго, што старажытныя назіральнікі фіксавалі існаванне шляхецкага маўлення ці, прынамсі, асобных яго

[123] Сярод такіх спроб у якасці паказальнага прыкладу можна прывесці тлумачэнне „рускага" „вукання" як фанетычнага працэсу па змене прасл. *ô > *ӥ* > *і* (*соль* > *суль* > *сіль*), прапанаванае шэрагам даследчыкаў, параўн. П. И. Житецкий, *op. cit*., с. 116–120, 123–124; М. А. Жовтобрюх, В. М. Русанівський, В. Г. Скляренко, *op. cit*., с. 273–278; Ю. Шевельов, *op. cit*., с. 406–423, што вельмі спекуляцыйна. Гэтае „вуканне", вядомае ў помніках толькі з сярэдзіны XIV ст., адзначаецца на ўсёй Украіне на працягу ўсяго XVIII ст. ад тэалагічных ды рытарычных трактатаў і актаў соценых канцылярый да інтэрмедый і вершаваных лістоў, гл. В. М. Русанівський, *Історія української літературної*…, с. 119, 135, 138, 144, калі ў помніках ужо выразна быў засведчаны ў гэтай пазіцыі *і*, тады як у XIX ст. ва ўкраінскіх тэкстах ад „вукання" і следу не засталося. Гэта ячшэ раз ставіць пад пытанне сувязь „вукання" з дыялектам. Але як было паказана вышэй, яно адзначаецца і ў беларускім арэале (хаця і рэшткава), што зусім разбурае пабудовы пра дыялектнае (і выключна ўкраінскае) паходжанне „вукання" і прымушае звярнуцца менавіта да арфаэпічнага тлумачэння.

[124] І. Огієнко, *Українська літературна мова XVI ст*…, с. 138–141.

[125] Ф. Ткач, *op. cit*., с. 73.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



рыс. Прыкладам могуць служыць заўвагі Пятра Статорыуса, раманамоўнага вучонага-эмігранта ў Польшчы, які добра ведаў польскую мову, але быў знаёмы і з усходнеславянскім маўленнем. Яго сведчанні тым больш цікавыя, што належаць філолагу і зроблены ў часы напярэдадні Люблінскай уніі.

Напачатку сваёй лацінамоўнай граматыкі (1568) Статорыус адзначае, што польская мова мае свае дыялекты: *linguae suos idiotismos non iuerim inficias*…[126]. Затым у розных месцах сваёй працы граматыст згадвае гэтыя тры дыялекты: мазурскі, украінскі і літоўскі[127] Малаверагодна, што за імі трэба бачыць нейкія дыялектныя ўтварэнні ў сучасным разуменні (г. зн. вясковыя гаворкі); хутчэй за ўсё пад дыялектамі вучоны разумеў проста розныя варыянты польскай мовы ў Рэчы Паспалітай (у самой Польшчы[128]; на Украіне; у Беларусі з Літвой), г. зн. некалькі варыянтаў т. зв. polszczyzny kresowej (ці польскага або паланізаванага маўлення на няпольскіх (усходнеславянскіх) абшарах)[129].

У сваёй працы Статорыус падае і прыклады гэтага маўлення, прынамсі „літвінаў" (г. зн. беларусаў), яўна паланізаванага: *Lituani eleganter formant sua patronymica in* ic*, ut Andrys/Andrysowic, Fiedur/Fiedurowic. Poloni circumscribunt* Syn Andrzeiow, Syn Ianow[130]. Тут падаюцца менавіта беларускія формы імёнаў (а не польскія ці ўкраінскія): *Андрысь*/*Андрусь* (параўн. укр. *Андрій*, польск. *Andrzej*) і *Федар*/*Фядор*, аднак апошняе – з яўнай польскай маўленчай рысай: закрытым галосным (т. зв. *o* pochylonym, ці ścieśnionym), які нярэдка перадаваўся ў польскім пісьме ВКЛ праз *u* (*krul*, *wozuw* і інш.), а ў кірылічным – праз *у* ці *ю*, гэта і ёсць

[126] P. Statorius, *Polonicae grammatices institutio*, Cracoviae 1568, ed. R. Olesch, Slavistische Forschungen 26, Köln–Wien 1980, S. 4; Z. Klemensiewicz, *op. cit*., s. 374.

[127] W. Kuraszkiewicz, R. Olesch, *Vorwort*, In: P. Statorius, *Polonicae grammatices institucio*, Cracoviae 1568, ed. R. Olesch, Slavistische Forschungen 26, Köln–Wien 1980, s. XIX–XX.

[128] Магчыма, далёка невыпадкова, што ў Статорыуса ў якасці асобнага дыялекта фігуруе менавіта Мазовія, якая мае адметныя дыялектныя асаблівасці. Натуральна, пад дыялектам ён мог разумець не столькі вясковую гаворку (яна калі і заўважалася, магла проста не ўлічвацца з прычыны сваёй непрэстыжнасці), колькі маўленне вышэйшых класаў (шляхты і духавенства) гэтага рэгіёна. Таму невыпадкова разам з мазоўскім у Статорыуса названыя літоўскі (беларускі) і ўкраінскі (у ВКЛ ніякіх масіваў польскага насельніцтва на той час быць не магло). Відаць, яны адрозніваліся ад нейкага больш эталоннага польскага маўлення (напрыклад, прыдворнага, вучонага ці сталічнага) таго часу.

[129] Праўда, гэтаму можна даць і іншае тлумачэнне. Не выключана, што ўсю славянскую пісьмовую мову Рэчы Паспалітай раманамоўны Страторыус разглядаў як нейкі агрэгат, гл. І. П. Клімаў, *Старажытныя ўяўленні пра склад і межы кніжна-пісьмовай мовы*, „Веснік БДУ: Сер. 4: Філалогія; Журналістыка; Педагогіка" 2013, 3, с. 19–25, які складаецца з трох кампанентаў маўлення: польскага („мазурскага"), украінскага і беларускага („літвінскага"). Аднак у любым выпадку блізкасць двух апошніх кампанентаў да першага забяспечваў польскі ўплыў, які афарбоўваў маўленне беларускай і ўкраінскай шляхты.

[130] P. Statorius, *op. cit.,* s. 80–81.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



разгледжанае вышэй (гл. 1.2) „вуканне”, гл. у дэталях[131]; інакшы погляд[132] беспадстаўны). У прыведзеным прыкладзе Статорыус адлюстраваў маўленне беларускай (і ўкраінскай) шляхты, якое было афарбавана польскім уплывам.

Менавіта падобнае маўленне і ўтварала адметнасць беларускай і ўкраінскай шляхты (а таксама блізкага да яе духавенства), мацуючы адасобленасць пануючых колаў дзяржавы ад астатняга ўсходнеславянскага насельніцтва. Т. ч., гэтае маўленне мела выразна класавы характар і не магло з'яўляцца нічым іншым, як толькі нейкай культываванай практыкай (гл. вышэй). Такі погляд цудоўна тлумачыць шырокае распаўсюджанне гэтых рыс у „руських” помніках незалежна ад іх жанру і арэалу – нават там, дзе каланізацыя польскага элементу была нязначная ці адсутнічала наогул (усходнія, задняпроўскія ці задзвінскія, абшары). Такія рысы трымаліся доўга і ў часе – нават пасля знікнення Рэчы Паспалітай з палітычнай арэны, пранікаючы яшчэ ў раннія помнікі новых украінскай і беларускай моў XIX ст.

Падыход, прадстаўлены ў дадзенай працы, мае перш за ўсё метадалагічную вартасць, паколькі дазваляе вытлумачыць шырокую паланізаванасць „руських” помнікаў XVI–XVIII стст. без прыпісвання шляхце і духавенству той эпохі абавязковага ведання польскай мовы (у адваротным выпадку цяжка вытлумачыць крыніцы і шляхі такога шырокага ды ранняга пранікнення і распаўсюджання польскай мовы ў пануючых станах грамадства Беларусі і Украіны, асабліва на фоне даволі слабых слядоў польскага ўплыву, пакінутых у большасці сучасных гаворак). Безумоўна, білінгвізм прысутнічаў сярод пануючых колаў грамадства, аднак яўна не мог быць масавым (і тым больш каардынацыйным) нават сярод магнатэрыі і панства, не кажучы ўжо пра шляхту і духавенства. Для XVI–XVII стст. больш апраўдана казаць пра паланізаванае маўленне, што засвойвалася і культывавалася ў шляхецкіх асяродках як частка культуры свайго класа (стану), адкуль затым ірадыявала ў асяроддзе духавенства (а, магчыма, нават іншых колаў). Нездарма сучасныя гісторыкі падкрэсліваюць, што паланізацыя слаба захапіла ніжэйшыя колы пануючага класу, у прыватнасці, дробную шляхту[133], якая была тады і яго самай масавай часткай[134].

Прапанаваны падыход таксама прымушае перагледзець існуючыя тэорыі і канцэпцыі пра ступень ды кірунак тых ці іншых дыялектных уплываў у „руськім” пісьменстве, пра сувязь асобных яго помнікаў ці аўтараў з пэўным дыялектным арэалам. Падобны перагляд варта зрабіць і ў дачыненні да цяперашніх заходнеўкраінскіх гаворак, смялей тлумачачы многія іх асаблівасці польскім (і/ці славацкім) уплывам, а не толькі як архаізмы ды аналогіі. Між іншым, калі гэтыя

[131] І. П. Клімаў, *Адаптацыя спецыфічных польскіх галосных у паланізмах старабеларускіх помнікаў*, [у:] *Актуальныя праблемы паланістыкі: 2008*, рэд. С. Важнік, А. Кожынава, Мінск 2009.
[132] W. Kuraszkiewicz, R. Olesch, *Vorwort*, s. XXII.
[133] Н. Яковенко, *op. cit.*, с. 269.
[134] *Ibidem*, с. 49, 285, 292.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



гаворкі і не з'яўляюцца працягам ранейшага стану, што існаваў на ўсходнеславянскіх абшарах Рэчы Паспалітай да XIX ст., то могуць служыць яго добрым прыкладам. Калі такі даволі высокі ўзровень паланізаванасці фіксуецца яшчэ і зараз у жывых гаворках (заходнееўкраінскіх), то і раней мог існаваць нейкі лект з такім самым ці нават большым узроўнем паланізаванасці, функцыянуючы ў якасці жывога сродку зносін. Яго далейшы лёс патрабуе асобнага разгляду.

## Bibliografia

Awaniesau, R. I. (red.). (1964). *Narysy pa biełaruskaj dyjalektałohiji*. Minsk: Nawuka i technika.

Bardach, J. (2002). *Ad palitycznych da etnicznych narodau u Centralna-Uschodniaj Jeuropie*. W: J. Bardach, *Sztudyji z historyji Wialikaha Kniastwa Litouskaha* (s. 316–335). Pierakł. z polsk. M. Ramanouski, A. Istomin. Minsk: TAA Tipografija POLITMAG.

Bewzenko, S. П. (1960). *Istoryczna morfołohija ukrajinśkoji mowy: Narysy iz słowozminy ta słowotworu*. Użhorod: Użhorodśkyj derżawnyj uniwersytet.     .

Bułachowśkyj, Ł. A. (1956). *Pytannia pochodżennia ukrajinśkoji mowy*. Kyjiw: Wydawnyctwo AN URSR.

Bułyka, A. M., Żurauski, A. I., Swiażynski, U. M. (1979). *Histarycznaja marfałohija biełaruskaj mowy*. Minsk: Nawuka i technika.

Bułyka, A. M., Żurauski, A. I., Kramko, I. I., Swiażynski, U. M. (1988). *Mowa biełaruskaj piśmiennasci XVI–XVIII* stst. Minsk: Nawuka i technika.

Citko, L. (2006). *„Kronika Bychowca" na tle historii i geografii języka białoruskiego*. Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku.

Frick, D. A. (1994). *"Foolish Rus": On Polish civilization, Ruthenian self-hatred, and Kasijan Sakovyc*. *Harvard Ukrainian Studies. 18*(3–4), p. 210–248.

Jakowenko, N. (2008). *Ukraińśka szlachta z kincia XIV do seredyny XVII stolittia: Wołyń i Centralna Ukrajina* [wyd. 2-e, wyprawl. i perehl.]. Kyjiw: Krytyka.

Karskij, J. F. (1955). *Biełorusy: jazyk biełorusskogo naroda*, wyp. 1. W. I. Borkowskij (red.). Moskwa. Akadiemija nauk SSSR.

Karskij, J. F. (1956). *Biełorusy: jazyk biełorusskogo naroda*, wyp. 2–3. W. I. Borkowskij (red.). Moskwa: Akadiemija nauk SSSR.

Kernyćkyj, I. M. (1967). *Systema słowozminy w ukrajinśkij mowy na materiałach pamjatok XVI st.* Kyjiw: Naukowa dumka.

Klemensiewicz, Z. (1974). *Historia języka polskiego*. Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe.

Klimau, I. P. (2009). Adaptacyja spiecyficznych polskich hałosnych u pałanizmach starabiełaruskich pomnikau. W: S. Ważnik, A. Kożynawa (red.), *Aktualnyja prablemy pałanistyki*: 2008. (s. 129–142). Minsk: Prawa i ekanomika.

Klimau, I. P.. (2010). Adaptacyja spiecyficznych polskich zycznych u pałanizmach starabiełaruskich pomnikau. W: A. Kiklewicz, S. Ważnik (red.), *Pałanistyka = Połonistika = Polonistyka: 2009*. (s. 37–57).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



Klimau, I. P. (2010). Da prablemy funkcyjanalnaj stratyfikacyji starabiełaruskaj mowy u WKL XIV–XVIII stst. W: *Biełaruski archieahraficzny sztohodnik* (s. 157–170). Wyp. 11. Minsk: Biełaruski nawukowa-dasledczy instytut dakumientaznaustwa i archiunaj sprawy.

Klimau, I. P. (2010). Da pytannia pra paleski typ u supolnaj litaraturna-piśmowaj mowie biełarusau i ukrajincau XIV–XVIII stst. *Wołyń – Żytomyrszczyna: Istoryko-fiłołohicznyj zbirnik z rehionalnych problem*. *Żytomyr*, *22*(1), s. 57–71.

Klimau, I. P. (2013). Starażytnyja ujaulenni pra skład i mieży kniżna-piśmowaj mowy. *Wiesnik BDU: Sier. 4: Fiłałohija; Żurnalistyka; Piedahohika 3,* s. 19–25.

Kramko, I. I., Jurewicz, A. K., Janowicz. (1968) *Historyja biełaruskaj litaraturnaj mowy*. T. 2. Minsk: AN BSSR, Instytut mowaznaustwa imia J. Kołasa.

Łojka, P. A. (2002). *Szlachta biełaruskich ziamiel u hramadska-palitycznym życci Reczy Paspalitaj druhoj pałowy XVI – pierszaj treci XVII st*. Minsk: Wydawiectwa Biełaruskaha dziarżaunaha uniwiersiteta.

Kuraszkiewicz, W., Olesch, R. (1980). *Vorwort*. In: P. Statorius (1568). *Polonicae grammatices institucio* (S. V–XXXIX). Cracoviae. R. Olesch (ed.). (1980). *Slavistische Forschungen* 26. Köln-Wien: Böhlau Verlag.

Martel, A. (1938). La *langue polonaise dans les pays ruthènes Ukraine et Russia Blanche: 1569–1667*. Lille: Université de Lille.

Moskałenko, A. A. (1962). Do pochodżennia ukrajinskoji pysemnoji i pysemno-literaturnoji мови. *Praci Odeśkoho derżawnoho uniwersytetu. Serija fiłołohicznych nauk*, *152*(15), s. 97–111.

Moskałenko, A. A. (1962). Pro utworennia mowy ukrajinśkoji narodnosti i nacji. *Praci Odeśkoho derżawnoho uniwersytetu. Serija fiłołohicznych nauk*, 152*(*15), s. 129–141.

Ohijenko, I. (mitropolit Iłarion). (2004). *Istorija ukrajinśkoji literaturnoji mowy*. Uporiad., peredm., koment. M. S. Tymoszyk. [2 wyd., wypr.]. Kyjiw: Nasza kultura i nauka.

Ohijenko, I. (1930). *Ukrajinśka literaturna mowa XVI st. i ukrajinśkyj Krechiwśkyj apostoł 1560–ch rr*. T. 1. *Studiji do ukrajinśkoji hramatyky*, 7. Warszawa: Wydawnyctwo Warszawśkoho uniwersytetu.

Pluszcz, P. P. (1958). *Narysy z istoriji ukrajinśkoji literaturnoji mowy*. Kyjiw: Wydawnyctwo: Radiańska Szkoła.

Rusaniwśkyj, W. M. (2001). *Istorija ukrajinśkoji literaturnoji mowy*. Kyjiw: ArtEk.

Rusaniwśkyj, W. M. (1978). *Narodnorazmowna mowa jak dżereło rozwitku schodnosłowiańśkych literaturnych mow XVI – poczatku XVIII st.: Dopowid' na VIII Miżnarodnomu zjizdi sławistiw (Загреб – Lublana, weresеń 1978 r.)*. Kyjiw: Naukowa dumka.

Sobolewskij, A. I. (rec.). (1887). Karskij, Jewfimij Fiodorowicz. (1885). Obzor zwukow i form biełorusskoj rieczi. *Żurnał Ministierstwa narodnogo proswieszczenija, 251*, s. 137–147.

Statorius, P. (1568). *Polonicae grammatices institutio*. Cracoviae: M. Wirzbięta. R. Olesch (ed.). (1980). Slavistische Forschungen 26. Köln, Wien: Böhlau Verlag.

Swiencićkyj, I. S. (1958). Ełementy żywoji narodnoji mowy w pamjatkach ukrainśkoji literaturturnoji mowy u XIV–XVIII storiczczіach (s. 5–13). W: *Pytannia ukrajinśkoho mowoznawstwa*. Kn. 3. Lwiw: Wydawnyctwo Lwiwśkoho uniwersytetu.

Szakun, L. M. (1963). *Historyja biełaruskaj litaraturnaj mowy*. Minsk: Wydawiectwa Ministerstwa wyszejszaj, siaredniaj.spiecyalnaj i prafiesianalnaj adukacyi BSSR.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



Szewelow, J. (2002). *Istoryczna fonołohija ukrajinskoji mowy*. Perekł. z anhl. S. Wakulenko, A. Danyłenko. Charkiw: Akta.

Tkacz, F. (1962). Do putannia pro charakter ukrajinśkoji literaturnoji mowy u XIV–XVIII stolit'. W: *Pytannia istorycznoho rozwytku ukrajinśkoji mowy: praci miżwuz. nauk. konf. (Charkiw, 15–20 hrudnia 1959 r.), pryswiaczeni V Miżnarodnomu zjizdowi sławistiw* (s. 64–75). Charkiw: Wyd-wo Charkowśkoho derżawnoho uniwersytetu.

Żowtobriuch, M. A., Rusaniwśkyj, W. M., Sklarenko, W. H. (1979). *Istorija ukrajinśkoji mowy: Fonetyka*. Kyjiw: Wyszcza szkoła

Żurauski, A. I. (1967). *Historyja biełaruskaj litaraturnaj mowy*. T. 1. Minsk: Nawuka i technika.

Żyłko, F. T. (1966). *Narysy z diałektołohiji ukrajinśkoji mowy*. Kyjiw: Radianśka szkoła.

Żyrmunskij, W. M. (1936). *Nacyonalnyj jazyk i socyalnyje dialekty*. Leningrad: Izdatielstwo Chudożestwiennaja litietatura.

Żytieckij, P. I. (1889). *Oczerk literaturnoj istoriji małorusskogo narieczija w XVII wiekie s priłożenijem słowaria kniżnoj małorusskoj rieczi po rukopisi XVII wieka.* Kijew: Tipografija G.T. Korczak-Nowickogo.

## Summary

The paper discusses the linguistic and sociological base of Old Belarusian/Old Ukrainian (West Ruthenian), which was spoken in the Belarusian and Ukrainian territories of the Grand Duchy of Lithuania. In the sixteenth century the local szlachta (nobility/gentry) spoke Ruthenian (Russian), which was increasingly influenced by Polish, which was its characteristic feature. The study has distinguished and discussed sixteen phonetic, morphological and syntactic specificities that cannot be derived from local dialects or they occur in them sporadically and inconsistently nowadays. However, in the sixteenth and seventeenth centuries they were commonly found in writings in the Grand Duchy of Lithuania regardless of their genre and origin. The paper also criticizes the former position of scholars who sought dialectal features only in old writings whereas, owing to historical circumstances, these were reflected first of all in the speech of szlachta and clergy socially close to the nobility.

**Key words:** dialect, vernacular/colloquial speech, szlachta, clergy, Old Belarusian/Old Ukrainian, Polish

## Streszczenie

Artykuł poświęcono omówieniu podstawy językowo-socjologicznej języka zachodnioruskiego, który był używany na ziemiach białoruskich i ukraińskich Wielkiego Księstwa Litewskiego (WKL). W XVI wieku miejscowa szlachta porozumiewała się językiem ruskim, który ulegał coraz większym wpływom polskim, co stanowiło o jego specyfice. W opracowaniu wyodrębniono i omówiono 16 osobliwości fonetycznych, morfologicznych i syntaktycznych, które nie dadzą się wyprowadzić z miejscowych dialektów lub występują w nich współcześnie sporadycznie i niekonsekwentnie. Wcześniej jednak (XVI–XVII wiek) były powszechnie notowane w piśmiennictwie WKL, niezależnie od gatunku i pochodzenia.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 06/05/2026 12:30:42



**Wyrazy kluczowe:** dialekt, język potoczny, szlachta, duchowieństwo, język starozachodnioruski, język polski

**Рэзюмэ**

У артыкуле абмяркоўваюцца маўленчая аснова і сацыяльная база супольнай кніжнапісьмовай мовы на Беларусі і Украіне ў XVI ст. У гэты перыяд шляхецкае маўленне было прасякнута польскім уплывам, што і складае галоўную адметнасць ды спецыфіку гэтага маўлення. У даследаванні выдзяляюцца і каментуюцца 16 фанетычных, марфалагічных і сінтаксічных асаблівасцяў. Гэта, перш за ўсё, тыя асаблівасці, якія немагчыма вывесці з дыялектнай мовы, або якія вузка або непаслядоўна прадстаўленыя ў дыялектах ў цяперашні час, аднак раней былі шырока распаўсюджаныя ў друкаваных выданнях, незалежна ад іх жанру або паходжання.

**Ключавыя словы:** дыялект, прастамоўе, шляхта, духавенства, старабеларуская/стараўкраінская мовы, польская мова

UMCS